Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

...муніст... (б) Беларусі

Москва
Старая Площадь 4 ЦК ВКП(б)
Инструктору по массовой работе
янв.-дек.
Звезда—1

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 62 (5188)
САКАВІК 17 НЯДЗЕЛЯ 1935 г.
год выдання XVIII

## Большэвіцкае прывітанне і віншаванне перадавым ударнікам і ўдарніцам, знатным людзям Совецкай Беларусі

# Няхай жыве ВКП(б) і яе штаб—сталінскі ЦК на чале з вялікім зодчым соцыялістычнага будаўніцтва—любімым, мудрым Сталіным, пад кіраўніцтвам якога наша рэспубліка заваявала права на атрыманне Ордэна Леніна!

## БССР ОРДЭНАНОСНАЯ

Учора ў газетах апублікавана пастанова Саюзнага ЦВК, якой за выдатныя поспехі на працягу раду гадоў у галіне сельскай гаспадаркі і прамысловасці САЮЗНЫ ЎРАД УЗНАГАРАДЗІЎ ОРДЭНАМ ЛЕНІ[illegible] рад краёў, абласцей і рэспуб[illegible], у тым ліку і БЕЛАРУСКУЮ ССР і яе кіраўнікоў тт. ГІКАЛО і ГАЛАДЗЕДА.

Вестка аб узнагародзе Беларускай ССР ордэнам Леніна з надзвычайнай хуткасцю праляцела па прадпрыемствах і калгасах. З аграмадным энтузіязмам, з пачуццём большэвіцкай гордасці за свае поспехі сустрэлі працоўныя Беларусі гэта аграмаднейшай палітычнай важнасці рашэнне.

Соцыялістычны форпост Совецкага Саюза на рубяжы з капіталістычным Захадам—БССР, пад кіраўніцтвам партыі, пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна, пры аграмаднай брацкай дапамозе пралетарыята Совецкага Саюза, ператварылася ў адну з перадавых квітнеючых рэспублік вялікай краіны Советаў і заняла месца ў радзе ордэнаносных абласцей, рэспублік.

Гіганцкі шлях барацьбы і перамог пад кіраўніцтвам нашай партыі прарабілі працоўныя Совецкай Беларусі. Ленінска-сталінская нацыянальная палітыка адкрыла перад працоўнымі былой калоніі рускага самадзяржаўя небывалыя перспектывы для эканамічнага і культурнага росту.

Якія могуць быць параўнанні паміж старой лапатнай, забітай калоніяй царскай Расіі і Беларуссю совецкай, будуючай у брацкім адзінстве з народамі ўсяго неабсяжнага Совецкага Саюза бяскласавае соцыялістычнае грамадства. Іменна соцыялізм, іменна наша партыя і вялікі Сталін падынялі на нязмерную вышыню той край, які пры

...рысоўваюцца на фоне катастрафічнага заняпаду эканомікі і культуры ў Заходняй Беларусі, якая знаходзіцца пад ярмом польскага імперыялізма. Асабліва яркі поспехі, дасягнутыя намі за апошнія некалькі гадоў. Беларуская ССР, якая ў мінулым асабліва адставала на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва, дзякуючы большэвіцкаму кіраўніцтву ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало, вышла ў рады самых перадавых рэспублік і абласцей СССР.

ЦК КП(б)Б на чале з т. Гікало змагаўся за аўладанне сталінскім стылем работы. Ён штодзённа, штогадзінна паказваў узоры большэвіцкага ажыццяўлення дырэктыў ЦК ВКП(б) і асабіста таварыша Сталіна.

Поспехі нашы сталі магчымы і таму, што ЦК ВКП(б) і асабіста таварыш Сталін па-большэвіцку указваў і выпраўляў нашы памылкі, пабольшэвіцку кіраваў усім ходам соцыялістычнага будаўніцтва.

Цэнтральны Камітэт нашай партыі і таварыш Сталін яшчэ ў 1932 годзе ўказалі ЦК КП(б)Б на наяўнасць гніла-ліберальных адносін да класава-чужых элементаў, прыкрываючых сваю антысовецкую дзейнасць фальшывым нацыянальным сцягам.

Па справе Сцепуры ЦК ВКП(б) падкрэсліў факт скажэння ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі ў Беларусі. ЦК намеціў тады баявую праграму работы для КП(б)Б.

1932-33-34 гг. былі гадамі няўхільнага павышэння тэмпаў і якасці нашай работы на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва і асабліва па лініі сельскай гаспадаркі, па выкананню сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай.

Разбіты нагалаву беларускія на...



## ПРЫВІТАННЕ ЛЕНІНСКАГА КОМСАМОЛА

Сакратару ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО Н. Ф.,
Старшыні СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДУ Н. М.

Цэнтральны камітэт ЛКСМБ ад імя комсамольцаў і працоўнай моладзі рэспублікі шле вам палкае комсамольскае прывітанне і віншуе вас з узнагародай саюзнага ўрада ордэнам Леніна.

Мы ганарымся гэтай узнагародай, бо ў ёй уасоблена ваша ўменне і нястомнае кіраўніцтва большэвікамі, пралетарыямі і калгаснікамі Совецкай Беларусі ў барацьбе за выкананне ўказанняў тав. Сталіна, за соцыялізм.

Ордэн Леніна абавязвае нас, ленінскі комсамол — верных сыноў і дочак вялікай комуністычнай партыі — быць яшчэ лепшым яе памочнікам у справе ўмацавання БССР — надзейнага форпоста соцыялістычнай радзімы.

У барацьбе за новыя перамогі мы будзем выхоўваць моладзь у духу непрымірымасці да класавага ворага, у духу беззаветнай аданасці справе партыі Леніна—Сталіна.

Палкае прывітанне капітану краіны Советаў, нашаму дарагому настаўніку, вялікаму СТАЛІНУ!

Няхай жыве кіраўнік большэвікоў Беларусі тав. ГІКАЛО, пад кіраўніцтвам якога Беларусь стала ордэнаноснай рэспублікай!

Сакратар ЦК ЛКСМБ
АЎГУСТАЙЦІС.

## З яшчэ большай энергіяй за работу

ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

Пленум Полацкага райкома партыі сумесна з актывам, сабраўшыся для канчатковай праверкі гатоўнасці да сяўбы, выказвае сваю вялікую радасць з прычыны ўзнагароды нашай рэспублікі ордэнам Леніна.

Гэта ўзнагарода абавязвае нас не зазнавацца, а з яшчэ большай большэвіцкай напорыстасцю ўзяцца за работу.

Запэўняем, што Полацкі раён лепш падрыхтаваным сустрэне вясну 1935 года, каб на аснове рэалізацыі рашэнняў з'ездаў советаў і Сталінскага статута сельска-гаспадарчай арцелі дабіцца рэкорднага ўраджаю.

Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з лепшым сталінцам, ордэнаносцам таварышам Гікало!

Няхай жыве любімы правадыр усіх працоўных таварыш Сталін!

ПЛЕНУМ ПОЛАЦКАГА РАЙКОМА КП(б)Б.

## Наша прывітанне ордэнаносцам!

ЦК КП(б)Б, ЦВК, СНК БССР.

Рабочыя, калгаснікі і ўсе працоўныя Барысаўшчыны, у сувязі з узнагародай нашай рэспублікі ордэнам Леніна, шлюць свае шчырае большэвіцкае прывітанне ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР...

